ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 289 (1256) | ПАНЯДЗЕЛАК, 15-га сьнежня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 "
6 месяцаў . . . 1 р. 80 "
1 год . . . 3 р. 30 "
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сакратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.

Кошт асобнага №—2 кап.

Усім гаркомам, райкомам і ячэйкам

Бюро ЦК ЛКСМБ ухваліла ўключыцца ў правядзеньне агляду выкананьня ўдарнага кварталу і падрыхтоўкі да 3-га году пяцігодкі.

ЦК прапануе ўсім камітэтам і ячэйкам разгарнуць шырокую работу з тым, каб забясьпечыць актыўны ўдзел комсамольцаў і рабочай моладзі ў правядзеньні агляду. Агляд правесьці пад кутом погляду праверкі дзейнасьці ЛКСМБ у рэалізацыі адозвы ЦК УсеКП(б) ад 3 верасьня, выкананьня задач ударнага кварталу і падрыхтоўкі да X зьезду ЛКСМБ.

Сакратар ЦК ПАЛЯКОЎ.

III СЭСІЯ ЦВК БССР

Лічбы разгорнутага наступу соцыялізму па ўсяму фронту

З дакладу старшыні СНК БССР тав. ГАЛАДЗЕДА аб кантрольных лічбах народнай гаспадаркі БССР на 1931 год*)

Паўтараю, што ў сэнсе палепшаньня якасьці нашай продукцыі ў нас ёсьць многа прарываў, і тут мы павінны націснуць на ўсе пэдалі. З усёй энэргіяй і сілай пролетарыяту, і пролетарскай самакрытыкай, і жорсткасьцю падыходу да гэтага пытаньня мы павінны выправіць гэтыя хібы. У гэты пэрыод, калі ў нас маецца недахоп прамысловых тавараў, калі растучыя патрэбы рабочых і працоўных мас мы не можам цалкам задаволіць спажывецкімі таварамі, мы ня можам дапусьціць такога становішча, што вырабляемыя на нашых прадпрыемствах спажывецкія рэчы часта псуюцца. Гэта ёсьць, па сутнасьці, дзяржаўнае злачынства. Ну і тым больш недапушчальна, калі дапушчаецца дрэнная продукцыя ў цяжкой прамысловасьці, бо гэта, як усім вядома, адбіваецца на тэмпах нашай індустрыялізацыі. Якасьць вырабляемай продукцыі заслугоўвае вялікай увагі з боку ўсёй пролетарскай грамадзкасьці.

У галіне сельскай гаспадаркі мы таксама ня выканалі цалкам заданьня галовага разрэзу. Напрыклад пашырэньня пасеўнай плошчы мы дабіліся на 3,5 проц., а па пляну мы вызначылі—на 6,5 проц. Па жывёлагадоўлі мы проэктавалі на 29-30 г. прырост статку. На справе ў нас атрымалася, з прычыны ўжо амаль усім вядомых прычын, у мінулым годзе скарачэньне статка процантаў на 14.

Тая хваля злоснага забою жывёлы, якую праводзілі летась кулакі, падбухторваючы на гэта і бядняцка-серадняцкія масы,—прывяла да таго, што нам нават не ўдалося ўтрымаць статак жывёлы на ўзроўні 28-29 г.

Вось гэтыя недахопы нашай работы я хачу перад Сэсіяй ЦВК асабліва падкрэсьліць, таму, што калі мы гаворым аб станоўчых баках нашай працы, калі мы вышлі з вялікім перавыкананьнем проэктыровак пяцігодкі за гэты адпаведны год, то паасобныя ўчасткі і, асабліва, ўчастак нашай якаснай працы патрабуюць яшчэ шмат лепшага, патрабуюць ад нас далейшага напружаньня сіл, энэргіі і энтузіязму рабочае клясы.

Я сёньня ня буду прыводзіць папярэдніх вынікаў нашай працы па разьвіцьцю народнай гаспадаркі ў бягучым асобным ударным квартале, бо мы яшчэ ня маем магчымасьці хаця-б папярэдне зрабіць агульныя вынікі з нашай працы. Гэта мы зробім толькі ў канцы сьнежня. Але павінен сыгналізаваць, што тыя задачы, якія мы перад сабой ставілі ў пачатку асобнага ўдарнага кварталу, не на ўсіх вучастках выконваюцца як належыць.

Мы ставілі задачу выкананьня на 100 проц. усяго народна-гаспадарчага пляну асобнага кварталу і адначасова ставілі задачу перакрыць тыя недаборы, якія мы мелі па паасобных паказчыках, аб якіх я гаварыў, асабліва якасных паказчыках мінулага 1929-1930 г.

Я павінен заявіць на сэсіі ЦВК, што не на ўсіх вучастках мы гэтую дырэктыву, якая зьяўляецца сугуба важнай, выконваем. Цэлы шэраг прадпрыемстваў не перакрываюць тых недабораў, якія былі імі дапушчаны ў мінулым 1929-30 гаспадарчым годзе.

Я лічу, што Сэсія ЦВК павінна поўным голасам заявіць рабочым БССР, што застаўшыяся тыдні сьнежня, як апошняга месяцу асобнага ударнага кварталу, павінны быць скарыстаны для ўмацненьня тэмпаў работы нашай прамысловасьці, інакш можа здарыцца што мы станем перад фактам недавыкананьня пляну асобнага кварталу на некаторых вучастках нашай працы.

Там, дзе ня зусім добра стаіць справа з выкананьнем прамфінпляну, мы павінны выправіць недахопы ў застаўшыяся 20 дзён месяцу. Трэба гэтага зараз дабіцца. А як мы ўжо бачылі з прыкладаў, калі тое ці іншае прадпрыемства бралася як належыць нагнаць прапушчанае, то на працягу месяцу рабіла сапраўды галаваскружальныя посьпехі ў бок выкананьня плянавых заданьняў.

Вось, прыкладна, тыя даныя і факты, якія я лічыў неабходным прывесьці перад Сэсіяй ЦВК для характарыстыкі вынікаў другога году пяцігодкі, і тое, на што неабходна зьвярнуць увагу і мобілізаваць рабочыя масы БССР на выкананьне задач асобнага ўдарнага кварталу.

II. Кантрольныя лічбы разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры на 1931 г.

Падрыхтоўка да трэцяга году пяцігодкі, вызначэньне і ажыцьцяўленьне пляну гаспадарчых работ 1931 году зьяўляецца задачай сугуба-важнай, якая стаіць перад пролетарыятам і працоўным сялянствам нашага Савецкага Саюзу, у тым ліку і Беларусі.

Трэці год, будзе па сутнасьці, рашаць генэральны лёзунг нашай партыі „пяцігодка ў чатыры гады“. Выходзячы з гэтага, мы падыходзілі конкрэтна да складаньня народна-гаспадарчага пляну на 1931 год.

Конкрэтна, мы проэктуем наступныя мерапрыемствы. Па прамысловасьці:

Плян капітальных работ па рэспубліканскай прамысловасьці намі вызначаны ў суме каля 108 міл. руб.

Прырост валавой продукцыі мы вызначаем на 104 проц. і думаем у грашовым выражэньні аб'ём валавой продукцыі па прамысловасьці ВСНГ давесьці да 581 міл. 900 тыс. супроць 284,5 мл. р. сёлета.

Па прамысловасьці НК Гандлю мы думаем павялічыць валавую продукцыю на 173,6 проц., па саюзнай прамысловасьці на 72 проц., а па мясцовай на 158 проц. Па саматужнай прамысловасьці намячаецца павялічэньне вырабу валавой продукцыі на 84 пр. і агульны аб'ём валавой прадукцыі па ўсіх галінах прамысловасьці мяркуецца павялічыць на 105,8 проц.

Рост вытворчасьці працы па рэспубліканскай прамысловасьці мы проэктуем на 30,4 проц., зьніжэньне сабекошту па рэспубліканскай прамысловасьці ВСНГ—на 10 проц., а па прамысловасьці НК Гандлю зьніжэньне сабекошту на 7 проц.

Рост зарплаты па рэспубліканскай прамысловасьці (без тарфяной прамысловасьці, па якой устаноўлены асобныя лічбы) проэктуем павялічыць у грашовым выражэньні на 8 проц. Прырост гарадзкога пролетарыяту мяркуецца на 31,7 проц. ці з 272,3 тыс. чалавек да 358,5 тыс. чал.

Па сельскай гаспадарцы. Агульную пасеўную плошчу кантрольнымі лічбамі намячаецца павялічыць на 12,4 пр. альбо ўзрост гэтай плошчы да 4083 тыс. га. Павялічэньне ўраджаю мяркуецца ў наступных лічбах: па збожжавых культурах у саўгасах на 12 пр., у колгасах—на 10 проц. і ў індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках на 8 проц., па льну—на 15 пр. і па бульбе—10 проц.

Найбольш важнай, рашаючай і сугуба адказнай задачай у разьвіцьці сельскай гаспадаркі зьяўляецца задача далейшай колектывізацыі—гэта значыць павялічэньне аграмаджанага сэктару ў нашай сельскай гаспадарцы.

Гэта проблема зьяўляецца важнай як з боку эканамічнага, так і палітычнага.

Мы, абмяркоўваючы кантрольныя лічбы ў СНК, улічылі той новы колгасны рух, той уздым колгаснага прыліву, які мы маем сёньня ў беларускай вёсцы.

Факты гавораць нам аб тым, што мы зайшлі ў паласу новай колгаснай хвалі, калі бядняцка-серадняцкія масы сялянства ўпэўніліся ў рэальнасьці колгаснага будаўніцтва, у яго выгаднасьці і пачалі новымі масамі ўступаць у старыя колгасы ці організоўваць новыя колгасы. Сёньня ўжо няма ніводнага кутка Савецкай Беларусі, дзе-б мы не назіралі новага колгаснага прыліву.

Улічваючы гэта, а таксама агульную ўстаноўку ў тым, што ў нас да канца пяцігодкі ў асноўным будуць колектывізаваны бядняцка-серадняцкія гаспадаркі, мы орыентуемся на тое, што за ўвесь 31 год, г. зн. да 1-га студзеня 1932 г., у нас колгасамі будзе ахоплена да 45 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. На вясну 1931 году, нам думаецца, колгасы ахопяць процантаў да 30 бядняцка-серадняцкіх двароў. Гэтыя меркаваньні базуюцца на новым колгасным прыліве, які назіраецца сёньня ў вёсцы.

Задача рабочае клясы ўсяго савецкага актыву, а ў першую чаргу членаў ЦВК РВК, сельсаветаў, складаецца з таго, каб пад кіраўніцтвам партыі стаць на чале новай колгаснай хвалі, стаць на чале колгаснага руху і кіраваць ім.

Трэба стаць на чале організацыі мас, дапамагчы ім аформіцца ў колгасы,—тады задача будзе выканана; калі-ж савецкі актыў і савецкі апарат пацягнецца ў хвасьце, то справа пойдзе самацёкам, а гэта значыць, пойдзе опортуністычным шляхам.

Агульны аб'ём укладаньняў на забясьпечаньне сельскай гаспадаркі машынамі намі проэктуецца ў разьмеры 30 міл. рублёў, з якіх 4,6 м. р. спэцыяльна вылучаецца на завоз трактароў. Агульны кошт мерапрыемстваў (капітальныя ўкладаньні), вызначаных кантрольнымі лічбамі на 1931 г. па сельскай гаспадарцы, намі проэктуецца ў 238,8 міл. руб., з якіх вызначана ўцягненьне ўласных сродкаў насельніцтва, організацый і ўстаноў у разьмеры 70,8 міл. руб., астатнія—крэдыт дзяржаўны і мясцовы бюджэт.

Па мэліорацыі мы мяркуем програму на 1931 год значна пашырыць у параўнаньні з гэтым годам. Мы сёлета мелі аб'ём працы ў грашовым выражэньні на суму каля 8 міл. руб. на наступны год мы проэктуем укласьці ў мэліорацыю 22,2 міл. руб. з іх на гідротэхніку, г. зн. на асушальныя работы 18,5 міл. руб., астатнія павінны пайсьці на культуртэхніку, асваеньне мэліораваных зямель і г. д.

Пасьля вырашэньня ў асноўным збожжавай проблемы, зараз перад намі стаіць ва ўвесь свой рост задача разьвіцьця жывёлагадоўлі. Гэта рашэньне і палепшаньня матэр'яльнага становішча рабочае клясы. У нас ёсьць некаторыя цяжкасьці з забясьпечаньнем рабочых ў першую чаргу мяснымі і жыравымі продуктамі. Мы гэтага ня хаваем. Вырашэньне задачы палепшаньня рабочага забясьпечаньня ўпіраецца ў першую чаргу ў разьвіцьцё жывёлагадоўлі.

Якія вагары ў нас маюцца для вырашэньня гэтай важнейшай задачы разьвіцьця жывёлагадоўлі?

Такімі вагарамі, як і ў збожжавай проблеме, мы лічым організацыю буйных савецкіх і колектыўных жывёлагадоўчых гаспадарак. Таму мы, у нас на Беларусі, паставілі і вырашаем проблему разьвіцьця сьвінагадоўчых савецкіх гаспадарак, а таксама проблему разьвіцьця спэцыялізаваных колгасаў.

Мы ставім задачу разьвіцьця буйнай рагатай і малочнай жывёлы таксама ў першую чаргу ў савецкіх і колектыўных гаспадарках. Мы сёлета таго-сяго ўжо дабіліся. Я ня буду заграмаджваць вас лічбамі, але скажу, што мы павінны будзем толькі па саўгасах „Сьвінавод“ у 1931 г. паставіць 70000 сьвінаматак; значная частка (тысяч дваццаць чатыры) ужо стаіць у саўгасах „Сьвінаводу“.

Мы орыентуемся на тое, у сярэднім што кожная сьвіньня прынясе нам за год ня менш 5 парасят. (Галасы з месца: Значна больш!) Мы бярэм мінімум, мы бярэм такую лічбу, каб пры ўсялякіх умовах не пралічыцца.

Такім чынам, мы будзем мець такую мясную продукцыю, якая ў асноўным ужо прадстаўляецца вялізарным рэзэрвам, якім мы можам опэраваць для рэгуляваньня забясьпечаньня мясапродуктамі.

Я не кажу аб тысячах сьвінаматак, якія знаходзяцца ў колгасах, як у масавых організацыях, дзе лічбы сьвінаматак у некалькі разоў перавышаюць лічбу сьвінаматак сьвінагадоўчых саўгасаў.

Конкрэтна мы думаем да вясны 1931 г. павялічыць пагалоўе буйнай жывёлы з 1741 тыс. штук да 2204 тыс. альбо на 20,6 проц., у тым ліку кароў на 5,7 проц., сьвіньняў на 50 пр. Агульны рост статку ў пераводзе ўсёй жывёлы на буйную рагатую мы проэктуем павялічыць на 19,2 проц.

Па народнай асьвеце мы проэктуем выдаткаваць у 31 годзе 176,4 міл. руб., у тым ліку на капітальныя ўкладаньні—55,8 міл. руб. Мы думаем, што контынгент вучняў ва ўсіх нашых школах, у нашых ніжэйшых, сярэдніх і вышэйшых навучальных установах, мы зможам давесьці да такіх разьмераў, што ў нас на кожную 1000 чалавек будзе вучыцца 295 чал., гэта зн. 29,5 проц. усяго насельніцтва (і маладога і дарослага) будзе сядзець на школьных лавах. Сёлета на кожную тысячу чалавек насельніцтва (калі лічыць усіх дзяцей ад месячнага ўзросту) вучыцца каля 223 чалавек. Вы бачыце, таварышы, якія вялізарныя задачы стаяць перад намі ў галіне народнай асьветы, а значыць і ў справе падрыхтоўкі новага маладога пакаленьня, падрыхтоўкі новых кадраў для соцыялістычнага будаўніцтва. Для Беларусі гэта задача асабліва важная, як для рэспублікі, якая ў мінулым зьяўлялася занядбанай, няпісьменнай краінай. Мець 29,5 проц. вучняў ад усяго насельніцтва—гэта зьяўляецца для нас вялікай заваёвай Кастрычнікавай рэвалюцыі.

Асыгнаваньні на навуку і на навукова-дасьледчую справу па ўсіх крыніцах мы думаем зрабіць у 31 годзе ў 8,6 міл. руб., гэта ня лічачы тых выдаткаў, якія будуць праводзіцца на тэрыторыі БССР з усесаюзных навукова-дасьледчых установах, працуючых у нашай Рэспубліцы.

Па комунальна жыльлёваму будаўніцтву мы проектуем наступныя лічбы: агульныя ўкладаньні ў комунальную гаспадарку мы мяркуем у разьмеры 18,5 міл.; укладаньні на жыльлёвае будаўніцтва па аграмаджанаму сэктару мы мяркуем у суме 30,1 міл. рублёў, (супроць 10,7 міл. па пляну 29-30 году). Па транспарту мы проэктуем правесьці вось такія капітальныя ўкладаньні: у водны транспарт суму ў 16,6 міл., на дарожнае будаўніцтва (разам з працпавіннасьцю на дарожнае будаўніцтва)—27 міл., у галіне чыгуначнага будаўніцтва мы ставім задачу, каб прыцягнуць сродкі саюзнага НКПС у разьмеры 17,8 міл. руб. па сувязі, якая цяпер набывае асаблівае значэньне ў зьвязку з ліквідацыяй акруг і пераходаў на раённую сыстэму, мы думаем вызначыць капітальных укладаньняў у разьмеры 32,2 міл. руб. і асобна мы вызначаем фінансаваньне на радыёфікацыю і радыёвяшчаньне ў суме 4,2 міл. руб. Такім чынам, усе выдаткі па галіне сувязі, разам з радыёфікацыяй і радыёвяшчаньнем намі вызначаюцца ў 36,6 міл. руб.

Па ахове здароўя, ва ўсіх крыніцах фінансаваньня (саюзны бюджэт, рэспубліканскі і мясцовы бюджэт), мы думаем укласьці 40,6 міл., ды яшчэ да гэтага прыбаўляецца бюджэт соцыяльнага страхаваньня, які праходзіць асобна ад нашага дзяржаўнага і мясцовага бюджэту і які Саўнаркомам на 31 год зацьверджаны ўжо ў разьмеры 45,5 міл. рублёў. Калі ў папярэднія гады мы зацьвярджалі толькі дзяржаўны бюджэт, дык сёлета мы будзем зацьвярджаць на Сэсіі і бюджэт, і ўвесь фінансавы плян. Саўнаркомам гэты фінансавы плян прыняты ў наступных разьмерах: агульны аб'ём фінпляну выражаецца ў 727 міл., што больш за плян мінулага году на 70 проц. Аб'ём рэспубліканскага бюджэту намі вызначан у 289,7 міл. р. Мясцовы бюджэт Саўнаркомам мяркуецца ў 145,6 міл. руб.

Вось таварышы, тыя кароценькія лічбы, якія характарызуюць нашыя лімітныя ўстаноўкі на 1931 гаспадарчы год—на трэці і рашаючы год нашай пяцігодкі. Я павінен зрабіць агаворку, што ўсе якасныя паказчыкі нашых кантрольных лічбаў зьяўляюцца канчатковымі і належыць безадкладна прыступіць да іх выкананьня. Што-ж датычыцца капітальных укладаньняў і аб'ёму валавой продукцыі прамысловасьці, дык тут лічбы намі прыняты як орыентовачныя; таксама Сэсіі ЦВК прыдзецца прыняць іх як орыентовачныя лічбы, бо яны могуць у той ці іншы бок пацярпець некаторыя зьмены, калі мы будзем канчаткова зьвёрстваць народна-гаспадарчы плян на 1931 год. На гэтым дазвольце мне і скончыць характарыстыку вынікаў мінулага году, і проэкту кантрольных лічбаў на 1931 г.

(Канец у наступным нумары)

*) Працяг. Пачатак гл. ва ўчарашнім нумары „Ч. З.“

Мал. нямецкага пролетарскага мастака ОТТО БІТТЭР



На варце

Курс—на вывучэньне вайсковай справы

Рабочая класа ў цесным саюзе з працоўным сялянствам, пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі, на падставе шырока разгорнутага соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва гіганцкімі крокамі ідзе да выкананьня і перавыкананьня пяцігодкі ў 4 гады.

Шырокі размах соц. будаўніцтва выклікае супраціўленьне капіталістычных элемэнтаў як унутры краіны, так і за межамі яе.

Праз шкодніцтва і падрыхтоўку інтэрвэнцыі клясавы вораг імкнецца сарваць соцыялістычнае будаўніцтва і ўстанавіць фашысцкую дыктатуру. Гэтыя імкненьні яскрава падкрэсьліваюцца дзейнасьцю контррэволюцыйнай організацыі, „прампартыі“, а ў нас, у Савецкай Беларусі,—контррэволюцыйнай нац. дэмакрацкай групай.

На чале ўсіх гэтых антысавецкіх комбінацый стаяць імпэрыялістычныя дзяржавы і ў першую чаргу Францыя. Французскія залатыя склепы забясьпечваюць усім неабходным тыя краіны, якія ў першую чаргу рыхтуюцца супроць СССР. Гэта адносіцца да нашай „дэмократычнай“ суседкі — Польшчы, якая па словах Чэха-Славацкага комуністычнага дэпутата тав. **Сьліўка „выступае ў форме рэвольвэра, накіраванага на працоўных. Усе капіталістычныя краіны, і асабліва фашысцкая Польшча, шалёна рыхтуецца да вайны з Савецкім Саюзам. Гэта нават прымушан прызнацца старшыня латвійскай парляманцкай камісіі** па замежных справах--соцыял-дэмократ Цэленс.

— „Існуе небясьпека вайны,—гаворыць Цэленс,—паміж Савецкім Саюзам і Польшчай у сілу няправільнай політыкі Польшчы ў нацыянальным пытаньні і ў сілу яе імкненьня распаўсюдзіць свой уплыў на Бальтыцкія дзяржавы“.

Фашысцкія дыктатуры Польшчы „расчышчаюць“ сабе шлях да „пераможнага“ маршу на Савецкі Саюз. Для гэтага робяцца „цуды“, для гэтага бушуе ва ўсей сваёй нагаце фашысцкі тэрор, сотні людзей арыштоўваюцца, заганяюцца ў турмы, карцэры пад гукі оркестраў і бізуноў гоняць на „выбары“ цэлыя вёскі, арудуюць карныя экспэдыцыі, прымаюцца іншыя бесчалавечныя захады з тым, каб падрыхтаваць пакорлівых вояк супроць СССР, навесьці спакой у тыле.

Ганебны сэнс усіх выступленьняў, ад Пуанкарэ-вайна да самага паршывенькага белаэміграцкага пісакі, для нас зусім яскравы: банды міжнародных інтэрвэнтаў імкнуцца зноў організаваць узброены напад на СССР.

Склаўшыяся абставіны гавораць за тое, што сустрэча двух сьветаў (хто—каго?) стала сёньня бліжэй, чым калі-б тое ні было.

Працоўныя капіталістычных краін узмацняюць сваю дзейнасьць, яны на-чаку, яны гатовы стаць на абарону айчызны сусьветнага пролетарыяту—СССР. Гэта прымушана прызнаць нават радыкальная газэта „Рэпюблік“. „Народныя масы Францыі,—піша газэта,—не згодзяцца, каб на іх надзелі ранцы і павялі заваёўваць Маскву“.

Чырвоная армія—верны абаронца пролетарскай дыктатуры—разам з усёй рабочай клясай прымае актыўны ўдзел ў пабудове соцыялізму, павышаючы мэтадамі соцспаборніцтва і ўдарніцтва сваю баявую вучобу. Комсамольцам і рабочай моладзі неабходна, асабліва зараз, яшчэ з большай энэргіяй узмацняць сувязь з Чырвонай арміяй, павялічваць свае вайсковыя веды. Трэба заўжды памятаць, што „грамаднай скалою стаіць наша краіна, абкружаная акіянам буржуазных дзяржаў“. Гэтыя буржуазныя дзяржавы точаць зброю, лязгаюць зубамі ў чаканьні моманту нападу.

Працоўная моладзь павінна быць гатовай даць адпор тым, хто пасьмее пасягнуць на наша будаўніцтва. Комсамольцы ні на хвіліну не павінны забываць 22 параграф свайго статуту:

— „Комсамолец памятае, што ён павінен умець абараняць пролетарскую рэволюцыю са зброяй у руках,... таму кожны комсамолец павінен уважліва вывучаць ваенную справу“.

Комсамол зьяўляецца шэфам Чырвонага флёту, ЛКСМБ—шэф АБВШ. Гэта абавязвае кожнага комсамольца заўжды памятаць аб сваіх абавязках конкрэтна ажыцьцяўляць шэфства.

Комсамол Савецкай Беларусі—шэф АБВШ. Але гэта шэфства заключаецца пакуль што ў выпадковых спатканьнях. Матар'ялы, зьмешчаныя сёньня ў нашай газэце расказваюць аб працы і жыцьці нашага падшэфніка, і няўважлівых адносінах да яго з боку комсамольскай організацыі. Трэба зьнішчыць „дэкадныя“ кампанейскія адносіны да справы ваенізацыі. Мы абавязаны справе ваенізацыі аддаць усе 36 дэкад.

Узмацніць сувязь з Чырвонай арміяй

Сувязь комсамолу з Чырвонай арміяй—пытаньне сёнешняга дня. Як-жа комсамол фабрык і заводаў практычна ажыцьцяўляе сувязь з часткамі Чырвонай арміі?

Трэба сказаць, што ў гэтым напрамку застаецца пажадаць шмат лепшага. Возьмем, напрыклад, Аб'яднаную Вайсковую Школу, над якою шэфствуюць комсамольскія організацыі заводу „Энэргія“ і чыгуначнікі. Гэтыя організацыі зусім забыліся пра сувязь з АБВШ. Яны вельмі рэдка наведваюць і зусім ня цікавяцца нашай работай і вучобай.

Комсамольскія ячэйкі заводу „Энэргія“ і чыгуначнікі павінны больш шчыльна зьвязацца з АБВШ, больш азнаёміцца з жыцьцём і бытам Чырвонай арміі і абменьвацца вопытам сваёй работы.

А. Шрубок.

Увага кузьні камандзіраў!

ЛКСМБ НЕ ВЫКАНАЎ УЗЯТЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ПА ШЭФСТВУ НАД АБВШ

Перанясем вопыт ударных брыгад у практыку вучобы АБВШ, вайсковую вывучку у практыку ўдарных брыгад на вытворчасьці

Ударна рыхтуемся да зьездаў

Комсамольская організацыя АБВШ рыхтуе рапарт X зьезду комсамолу Беларусі, як свайму шэфу, аб становішчы работы організацыі і аб ходзе вучэбна-баявой падрыхтоўкі.

Ячэйка ЛКСМБ 2-й батарэі АБВШ каб выканаць пастаўленыя колектывам школы задачы, распачала сваю працу на аснове соц. спаборніцтва і ўдарніцтва.

На агульным комсамольскім сходзе ячэйка 2-й батарэі абвясьціла сябе цалкам ударнай і падрыхтоўваецца да зьездаў ЛКСМБ і УсеЛКСМ

Плян падрыхтоўкі да зьездаў, які дадзен колектывам школы быў спатканы з вялікім жаданьнем яго выканаць.

Галоўныя пункты працы ячэйкі наступныя:

а) Праверыць ход і выкананьне комсамольцамі соцспаборніцтва.

б) Прэзыдыуму ячэйкі кожную дэкаду праверыць, хто парушае дысцыпліну, выклікаць на прэзыдыум і ганьбіць, здаючы матар'ял у друк.

Маюцца ўжо вынікі: стопроцантная выпіска комсамольцамі „Чырвонай Зьмены“ і 35 проц. „Комсамольскай Праўды“.

Соцспаборніцтвам ахоплена 80,5 проц. комсамольцаў па розных відах вучэбна-баявой падрыхтоўкі.

Ячэйка выклікала на соц. спаборніцтва ячэйку 1-й батарэі.

Янка Даніловіч.

Выканаем узятыя абавязкі

Курсанты і начсклад культроты АБВШ, у адказ на вылазкі правaопортуністычных і „левых“ контррэволюцыйных элемэнтаў, на шкодніцтва „прампартыі“ і на контррэволюцыйную дзейнасьць беларускіх нацдэмократаў, абвясьцілі сябе ўдарнікамі імя трэцяга году пяцігодкі і ўзялі на сябе абавязкі ўмацняць баявую магутнасьць Чырвонай арміі.

У галіне стралковай падрыхтоўкі дабіцца пападаньня ў цэль: з вінтоўкі на 88,2 проц., з станкавога кулямёта „Максіма“—на 89,3 проц., з ручных кулямётаў—на 88,3 проц., набіўка кулямёта, устаноўка прыцэльніка, кальца і цэліка—20 сэкунд (з наводкай), разборка і зборка кулямёта „Максіма“ — 1 хв. 30 сэкунд., разборка і зборка замка „Максіма“—50 сэкунд, запражка коняй у тачанку і сані—1 хвіліна, згатоўка для стральбы з тачанкі па наземных цэлях—40 сэкунд, пераход кулямёта з станка „Сокалава“ на зэнітную ўстаноўку — 1 хвіліна 10 сэк., пабудова роўналежнай вагі з дакладнай адметкай—1 хвіліна 20 сэкунд, падрыхтоўка даных для стральбы на камандзірскім пункце па адной цэлі—4 хв.; складаньне кутавога пляну на трох цэлях—2 хвіліны; падрыхтоўка даных для стральбы па закрытых цэлях бяз прытвораў пры дапаможным пункце—2 хв. 30 сэкунд; падрыхтоўка даных для стральбы цераз галовы сваіх войск — 45 сэк.; у інтэрвалы сваіх вілак—40 сэк.

Усю сваю працу праводзім пад лёзунгам:—ніводнай бруднай вінтоўкі і кулямёта! Ніводнай порчы матар'яльнай часткі з усёй нашай тэхнікі!

Курсанты АБВШ: Шрубок Алесь, Вайтовіч Якуб, Ясючэня Мікола.

АБВШ змагаецца за пяршынства

АБВШ к новаму навучальнаму году прышла з добрымі паказчыкамі ў справе стралкова-тактычнай падрыхтоўкі. Школа заняла па стралкова-тактычнай падрыхтоўцы 1-е месца сярод частак Беларускай Вайсковай Акругі, за што атрымала прыз Савету Народных Камісараў БССР.—Сярод вайскова-навучальных устаноў школа па стралковай падрыхтоўцы заняла першае месца. Трэба адзначыць, што вайскорская організацыя АБВШ адыграла вялізарную ролю ў справе дасягненьняў школы ў баявой падрыхтоўцы. Вайскорская організацыя сваячасова сыгналізавала аб недахопах і прарывах у баявой падрыхтоўцы трапна біла па слабых і вузкіх мясцох.

К новаму навучальнаму году вайскорская організацыя АБВШ паставіла перад сабой новыя задачы—выцягнуць школу на першае месца сярод вузаў і частак рабоча-сялянскай Чырвонай арміі, каб памагчы камандваньню выканаць пастаўленыя РВС перад вайсковымі школамі новыя задачы, вайскорская організацыя АБВШ організавала вайскорскую ўдарную справную брыгаду з чырвонаармейцаў курсантаў і начскладу з 25 асоб і вайскорскія пасты з 6 асоб па ротах і батарэях. Брыгада і пасты будуць садзейнічаць камскладу, забясьпечыць матар'ялам ротныя ільлічоўкі, школьную шматтыражную газэту „Чырвоны Сьцяг“, акруговую „Чырвонаармейскую Праўду“ і мясцовыя менскія газэты. Лёзунг—„АБВШ на першае месца сярод вузаў і частак РСЧА“—застанецца і на цэлы навучальны год. Можна спадзявацца, што пры дапамозе вайскорскай організацыі, якая па-ударнаму ўзялася працаваць, пастаўленыя загадам РВС задачы будуць выкананы.

Ясючэня, Вайтовіч.

Лепшы камандзір—ударнік

Адзначаючы дасягненьні школы ў баявой падрыхтоўцы, мы ня можам не адзначыць нашых лепшых камандзіраў—ударнікаў. Дзякуючы іх энэргічнай працы, мы ўмацоўваем баявую падрыхтоўку школы.

Т. Хведаровіч—курсавы камандзір культроты—член КП(б)Б аддае ўсе свае веды і сілы на узмацненьне баявой падрыхтоўкі. Яго разьдзел першым абвясьціў сябе ўдарным. імя 16 партзьезду. Гэты ўдарны разьдзел дасягнуў значных посьпехаў. Так, па стралковай справе даваў лепшыя паказчыкі ў баявой падрыхтоўцы, на ўсесаюзных выпярэдніцтвах--па стралкова-фізычнай падрыхтоўцы. Разьдзел заняў 3-е месца сярод вайсковых навучальных устаноў РСЧА

Зараз тав. Хведаровіч таксама першым абвясьціў сябе ў школе ўдарнікам імя 3-га году пяцігодкі, узяўшы на сябе цэлы шэраг адказных задач.

Разьдзел т. Хведаровіча ідзе першым у баявой падрыхтоўцы.

Вайтовіч.
Ясючэня.



Тав. Хведаровіч

Будні кузьні камандзіраў

Чырваньню усход пакрываўся. Раніца нясутрымна лезла ў вокны. Набліжаўся дзень напружанай працы новых посьпехаў і перамог.

На вуліцы было ўжо сьветла. Сьветла было і ў пакоях АБВШ. Школа яшчэ спала. Ня сьпалі толькі дзяжурныя ды днявальныя па ротах і батарэях.

Раптам сыгнал парушыў мёртвую цішу, рассыпаўся рэхам па школе.

— Падымайсь!—прaнеслася па ўсіх кутках.

Ажыла белая камяніца—кузьня чырвоных камандзіраў. Гоман і сьмех. Роўным строем вышлі курсанты на двор, каб разагнаць рэштку санлівасьці. Ногі рытмічна адбівалі; „раз, два, тры,—раз, два, тры“... Вось зацягнулі песьню:

Даёш, даёш спаборніцтва
Даёш вялікі плян
Мы школа беларуская
рабочых і сялян.

— Скончыць нагулянку!

— Умывальнік набіты біткам. Памыліся, ды за ранішнюю гарбату. А там, хто куды. Некаторыя групы ідуць у габінэты, дзе набываюць тэорэтычныя веды, некаторыя—у поле, замацоўваюць тэорыю практыкай.

Вось № група вынырнула з двара.

У некаторых на плечах разабраны „Максімка“. Зацягнулі, песьню:

„Никто пути пройденного
У нас не отберет
Школа белорусская
ударная впер態!“

Перад намі бугрыстыя палеткі. Кожны ацэньвае іх з боку баявой уласьцівасьці.

— Прыступіць да занятак!

— Таварышы! Тэма сёньнешніх занятак—стральба па замаскаваным ворагу. Мэта—навучыцца трапна страляць па замаскаваных цэлях, а таксама страляць з закрытых пазыцый—пачаў кіраўнік.

Кулямёты на мясцох. Камандзір заняў ужо наглядальны пункт агнём кіруе агнём кулямёта.

— Вэер! Асноўны правы. Асноўнаму 30—00 наводзіць у аддзельнае дрэва!

Вэер гатоў. На пункце кіпіць работа, камандзір вылічае...

— Правал 0—10, кальцо 26!

— Правей 0—10, кальцо 26 гатова!

Так курсанты АБВШ замацоўваюць на практыцы здабытыя веды. Тэорыя падмацоўваецца практыкай. Няпрыкметна ляцяць гадзіны.

Заняткі скончаны.

Роўнымі шарэнгамі строяцца курсанты і з песьнямі ідуць у школу. А там, у белай чыстай сталоўні чакае іх гарачае сьнеданьне, сьнеданьні—ізноў за працу.

Так праходзяць дні баявой падрыхтоўкі, дні вучобы, дні посьпехаў і перамог.

Мы гатовы выканаць баявы загад:

— Правей 0—10, кальцо 26 па ворагах рэволюцыі агонь!

— Ёсьць!—будзе наш адказ.

Алёша Янк

БЯЗЬЛІТАСНА ЗМАГАЦЦА З ШОВІНІЗМАМІ ЎСІХ КОЛЕРАЎ

Па-бальшавіцку разгортваць барацьбу з вялікадзяржаўным шовінізмам—галоўнай небясьпекай на даным этапе, рашуча біць па контр-рэволюцыйнай агэнтуры польскага фашызму—беларускіх нацыянал-дэмократах

Аўладаньне белмовай—важнейшая ўмова пасьпяховасьці будаўніцтва нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зьместу культуры

З усёй рашучасьцю змагацца з вялікадзяржаўным расійскім шовінізмам

У Менскім дзяржаўным політэхнікуме шэраг выкладчыкаў хварэе расійскім шовінізмам. Гэтая хвароба выкладчыкаў перадалася і на паасобныя колы студэнцтва. Вось факты:

Выкладаньне дысцыплін на 90 проц. праводзіцца па-расійску. Калі дырэкцыя тэхнікуму спрабавала правесьці выкладаньне на бел. мову, дык расійскія шовіністыя выступілі супроць.

Інжынэр Маскоў так і заяўляе: „Или я, или белорусский язык“. Інжынэры Кірык, Айсбэрг, Кавокін, Уланаў і Міхайлаў добра ўладаюць беларускай мовай, свае лекцыі выкладаюць на расійскай мове. Гэтыя інжынэры, прытвараючыся, нібы не разумеюць пытаньня, якія задаюцца студэнтамі на беларускай мове, прымушаюць пераводзіць іх на расійскую.

За імі сьледам ідуць і паасобныя студэнты. Так, напр., член ячэйкому Буцько кажа: „У Політэхнікуме на белмове выкладаць нельга, бо на гэтай мове няма тэхнічнай тэрміналёгіі“. Студэнт архітэктурна-будаўнічага аддзяленьня III-га курсу—комсамолец Дарожкін, будучы вылучаны ў камісію па праверцы навучальных пляноў, вымагаў ад камісіі ўставіць пункт аб скарачэньні белмовы і замене яе нямецкай, бо на думцы Дарожкіна, беларускую мову можна вывучаць у пазашкольных гуртках. Гэты-ж самы Дарожкін, калі курсы тэхнікуму складалі міжсобку соцумову аб штодзённым ужываньні беларускае мовы як на занятках, так і па-за школай, выказваўся супроць і патрабаваў зьнішчыць гэты пункт, бо ён лічыць, што тэхнікі ня будуць мець ніякай сувязі з сялянствам (?!).

Калі на комсамольскім сходзе зрабілі Дарожкіну заўвагу, каб ён гаварыў пабеларуску, дык гэтую заўвагу ён кваліфікаваў „дерзкой игрой“. Комсамолец Левітан, падтрымліваючы расійскага шовіністага Дарожкіна, заявіў:—„Беларускую мову хай вывучае Белпэдтэхнікум“. Студэнт І-га курсу фабрычна-заводскага ўхілу—Краўчанка—такжа выступіў супроць таго, каб гаварыць па-беларуску:—„Няхай мову вывучае БПТ, а нам, як будучым тэхнікам і інжынэрам, яна непатрэбна.

Ня лепш справа з вывучэньнем беларускае мовы і на колгасным аддзяленьні. Студэнты гэтага аддзяленьня эдмаўляюцца гаварыць па-беларуску і ўсе конспэкты і мэтодычныя распрацоўкі робяць на расійскай мове. Асабліва русіфікаваўся III-ці і IV-ты курсы.

Вялікадзяржаўны шовінізм спрыяў актывізацыі іншых шовінізмаў, асабліва анты-сэмітызму.

У сярэдзіне мінулага месяцу за антысэмітызм была выключана студэнтка Гудовіч, якая не магла пераварваць сваім нутром аўрэйскай націі. У час перапынкаў, калі студэнты-яўрэі размаўлялі на сваёй роднай мове, яна казала: „жыды па-свойму гіргечуць“.

У гэтым-жа месяцы на комсамольскім сходзе санітарна-тэхнічнага ўхілу разьбіралася справа студэнтаў аб невыкананьні вучэбных заданьняў. Студэнту Баркоўскаму далі вымову за тое, што ён сабатаваў заняткі не здаваў залікаў. Студэнту-яўрэю, які таксама прапусьціў некалькі лекцый і ня выканаў заданьне зрабілі толькі заўвагу, бо ў яго былі больш уважлівыя прычыны. Баркоўскі тады заявіў:—„Калі-б я быў яўрэем, мне-б таксама далі толькі заўвагу“.

Трэба адзначыць, што партыйны колектыў тэхнікуму, які налічвае каля 100 сяброў, не дае рашучага адпору ўсім гэтым вылазкам клясавага ворага на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Партыйна-комсамольская організацыя не завастрыла ўвагу студэнцтва на барацьбу з вялікадзяржаўным шовінізмам, як галоўнай небясьпекай, ца барацьбу з контр-рэволюцыйным нацыянал-дэмократызмам і шовінізмамі розных колераў. Партыйны і камсамольскі колектывы не патрабавалі з усёй рашучасьцю ад партыйцаў і комсамольцаў, выкладчыкаў і студэнтаў перайсьці на беларускую мову, яны ня выкарысталі паасобных фактаў вылазкі вялікарасійскіх шовіністых і антысэмітаў з тым, каб на конкрэтных прыкладах выкрыць соцыяльна-варожыя корні, згуртаваць шырокія колы студэнцтва на барацьбу з імі. Парт. і комс. колектывы не разгарнулі інтэрнацыянальна-выхаваўчай працы сярод студэнцтва.

Партыйная і комсамольская ячэйкі, і профком павінны зараз-жа па-бальшавіцку ўзяцца за справу ажыцьцяўленьня нацыянальнай політыкі партыі, павінны прыняць рашучыя захады пасіліць тэмпы беларусізацыі, павесьці рашучую барацьбу з расійскім шовінізмам, не паслабляючы барацьбы з контр-рэволюцыйным нацыянал-дэмократызмам і шовінізмамі розных колераў, мобілізаваць увагу шырокіх колаў студэнцтва на будаўніцтва культуры, нацыянальнай па форме і пролетарскай па зьместу.

Язэп Зязека.

Няма працы з нацменшасьцямі

У м-ку Узда шмат моладзі розных нацыянальнасьцяй: ёсьць яўрэі, палякі, татарская моладзь. Апошняя закінута, ніхто з ёй ніякай працы не вядзе. Татарская моладзь вольны час праводзіць за гульнёю ў карты, за пляшкай гарэлкі, наладжвае танцулькі ў час рэлігійных сьвят і г. д.

За гэтай моладзьдзю наглядаюцца выпадкі антысэмітызму, аб чым пісалася ў газэце, але ячэйка комсамолу разам з Райкомам КСМ ніяк на гэта не рэагавала.

Яшчэ ў пачатку 1930 году РК ЛКСМБ вынес вялікую пастанову аб працы з татарскай моладзьдзю, але гэта пастанова засталася на паперы. Райкамол яе ня выканаў.

За ўвесь час існаваньня комсамольскай ячэйкі ў Узьдзе, у комсамол прынялі толькі двух маладых татар.

Былы сакратар Райкамолу на адным з сходаў, куды нейк зашлі кабеты-татаркі, голасна заўважыў:

— Нязваны госьць—горш за татарына.

У такім складаным нацыянальным пераплёце, як у мястэчку Узда, патрэбна ўпартая работа з нацменшасьцю, чаго мы, нажаль, ня маем.

Комсамол павінен зьвярнуць на гэта належную ўвагу. **А. Ельяшэвіч.**

Адкрыты ліст Я. Купалы

Паважаны тав. рэдактар, прашу зьмясьціць у вашай газэце наступнае:

Адбываюцца нячуваныя, грандыёзнейшыя ў гісторыі чалавецтва падзеі. У СССР, адзінай на ўсім сьвеце краіне пролетарскай дыктатуры, рабочая кляса ў цесным саюзе з бядняцка-серадняцкімі масамі сялянства, пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі, рэальна ажыцьцяўленьне заветныя ідэалы найгеніяльнейшых настаўнікаў і правадыроў працоўнага люду—Маркса і Леніна, пераможна, з нявіданым творчым энтузіязмам і запалам будуе соцыялістычнае грамадзтва. Але шлях гэтага будаўніцтва ня лёгкі.

Капіталістычны сьвет усё з большай і большай трывогай, азьвярэньнем і нянавісьцю сочыць за гэтай соцыялістычнай будоўляй, добра ведае і адчувае, што справядлівай гісторыяй ужо палічаны апошнія гадзіны яго існаваньня. І ня толькі сочыць. Імпэрыялістычная загранічная буржуазія адзіным фронтам з рэшткамі капіталістычных элемэнтаў у СССР напружвае ўсе свае сілы для таго, каб перашкодзіць гэтай творчай рабоце працоўных мас, каб зьнішчыць соцыялістычную дзяржаву—апору сусьветнага рэволюцыйнага пролетарыяту ў барацьбе за вызваленьне з-пад ярма рабства і эксплёатацыі. Буржуазія як замежная, так і ўнутраная, не перабірае ніякімі мэтадамі і сродкамі барацьбы супроць СССР. Шкодніцтва, дывэрсія, шпіёўства, інтэрвэнцыя,—усё гэта пускаецца ў ход, каб толькі зруйнаваць такія бастыёны соцыялізму, як індустрыялізацыя і колектывізацыя, абы толькі ўзарваць пяцігадовы плян, які ажыцьцяўляецца нячуваным уздымам і захапленьнем рабочай клясы і бядняцка-серадняцкага сялянства пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі. Адгэтуль нязвычайна абвастрэньне клясавай барацьбы, адгэтуль шалёнае супраціўленьне капіталістычных элемэнтаў усім пачынаньням і мерапрыемствам савецкай улады.

Арэнай такой абвостранай клясавай барацьбы зьяўляецца, зразумела, і БССР. Але ва ўмовах нашай рэспублікі ролю зьбіральніка і організатара контр-рэволюцыйных сіл, ролю застрэльшчыка сусьветнага капіталізму ўзяў на сябе беларускі нацыянал дэмократызм, выступаючы пад сьцягам ліквідацыі ўсіх заваяваньняў Кастрычнікавай рэволюцыі, пад сьцягам рэстаўрацыі буржуазнага ладу, звароту капіталістым фабрык і заводаў, памешчыкам—зямлі, пад сьцягам паднявольваньня рабочых і сялянскіх працоўных мас.

Для зьдзейсьненьня гэтае мэты група контр-рэволюцыйных нацыянал-дэмократычных інтэлігентаў у хаўрусе і пад кіраўніцтвам заходня-беларускага нацыянал-фашызму, гэтай агэнтуры польскага імпэрыялізму, на працягу раду год вяла шкодніцкую контр-рэволюцыйную работу амаль на ўсіх вучастках соцыялістычнага будаўніцтва, накіроўваючы галоўныя ўдары, аднак, на лініі культуры і зямельнай экономікі. Пранікаючы і стараючыся паступова прыбіраць у свае рукі найадказнейшыя вучасткі савецкага дзяржаўнага апарату (Наркомасьветы, Наркомзем, БДВ і г. д., контр-рэволюцыйныя нацыянал дэмократы спадцішка, але няўхільна, падтачвалі соцыялістычныя элемэнты савецкай дзяржаўнасьці, падменьваючы іх нацыянальна-буржуазнымі. Асаблівую увагу аддавалі яны разбурэньню таго адзінства, тэй інтэрнацыянальнай базы, на грунце якое працоўныя масы ўсіх нацыянальнасьцяй СССР зьлітнымі калёнамі ідуць па шляху да соцыялізму. Лёзунгу аб'яднаньня рабочых і сялян—беднякоў і серадмякоў—розных нацыянальнасьцяй Савецкага Саюзу пад ленінскім сьцягам, контр-рэволюцыйныя беларускія нацыянал-дэмократы супроцьставілі лёзунг самабытнасьці беларускай нацыі, сэпаратысцкага разьяднаньня, нацыянальнага антагонізму, каб гэтым самым аблягчыць сваёй нацыянальнай буржуазіі перамогу, панаваньне ўгняценьне беларускіх працоўных мас. У гэтай контр-рэволюцыйнай рабоце беларускія нацыянал-дэмократы апіраліся, з аднаго боку, на кулацтва, якое ліквідуецца ва ўмовах колектывізацыі, як кляса, а з другога боку—на зарубежныя сілы і гэтым пракладвалі шлях для інтэрвэнцыі, бо яны добра ведалі, што ня ўласнымі сіламі, а толькі пры збройным **падтрыманьні замежнай інтэрвэнцыі змогуць зьнішчыць незалежную ім дык**татуру пролетарыяту, каб падмяніць яе дыктатурай капіталу.

Якую ролю я асабіста і мая літаратурная творчасьць адыгралі ў гэтай контррэволюцыйнай дзейнасьці беларускага нацыянал-дэмократызму?

На літаратурную ніву я ўступіў у 1905 г., надрукаваўшы свой першы верш „Мужык“. Мэта, якую ставіў я перад сваёй поэтыцкай творчасьцю, гэта было паказаць у мастацкай форме ўсю беднату, цемнату, нядолю і паднявольле батрацтва і бядняцтва беларускае вёскі, якая горка пакутвала пад соцыяльным і нацыянальным гнётам крывавага царызму. Але пачаўшы з 1908 г., у часы самае чорнае рэакцыі, працаваць у „Нашай Ніве“, я падпаў пад уплыў нашаніўскага дробна-буржуазнага і кулацкага нацыяналістычнага адраджанізму, захапіўся гэтымі адраджэнцкімі ідэямі нацыянал-дэмократычнай дзяржаўнасьці і пачаў іх адбіваць у сваёй далейшай творчасьці, апяваючы, як нешта цэлае, пазаклясавае, беларускі „народ“, ідэалізуючы ў некаторых сваіх творах гістарычнае мінулае, значыцца, фэодальна-паншчыннае Беларусі, зацямняючы гэтым самым клясавую сутнасьць соцыяльнае і нацыянальнае барацьбы за вызваленьне, якая і ў гэты пэрыод хоць прыдушана, але хвалявалася, узбуралася ў імкненьнях і парывах працоўных мас (нелегальная рэволюцыйная літаратура, забастоўкі і гэтак далей).

Гэтае захапленьне дробна-буржуазнымі нацыянал-дэмократычнымі ідэаламі прычыніласа таму, што я і ў першыя гады Кастрычніцкае рэволюцыі ня змог ад іх пазбавіцца ды ўразумець і ўсьвядоміць усю в ліч і гістарычную нямінучасьць пролетарскае рэволюцыі, якая адна несла сапраўднае соцыяльнае і нацыянальнае вызваленьне працоўным былой царскай Расіі, у тым ліку і Беларусі. Дзякуючы гэтаму свайму асьляпленьню, зьявіліся мае такія творы з ярка нацыянал-дэмократычнымі настроямі, як, напрыклад, „Паўстаньне“, „Перад будучынай“, п'еса „Тутэйшыя“ і інш.

Комуністычная партыя і савецкая ўлада даравалі мне гэтыя грубыя нацыянал-дэмократычныя памылкі ў маёй творчасьці, і за мае ранейшыя заслугі перад беларускім працоўным людам надалі мне высокую годнасьць народнага поэты. І ў апошнія гады я ўсімі сіламі намагаўся далучыцца сваей творчасьцю да вялікага соцыялістычнага будаўніцтва, якое так магутна разгортваецца ў нашай краіне, прыкладам, творы: пераклад „Інтэрнацыяналу“, „На сьмерць С. Булата“, „Безназоўнае“, „Арлянятам“, „Дзьве сястры“ (аб работніцы і сялянцы), „Шляхам гадоў“. „З угодкавых настрояў“ (на дзесяц.годзьдзе Кастрычнікавай рэволюцыі). „На магілках ваякаў“ (да дзесяцігодзьдзя БССР), „Дыктатура працы“, „Працай дружнай колектыўнай“ (аб выстаўцы) і інш. Але ўсё-ж такі ў гэтым напрамку я зрабіў вельмі мала, не зважаючы на тыя магчымасьці, якія мне давала партыя і савецкая ўлада.

Прасякнуты нацыянал-дэмократычнай заразай, прышчэпленай мне нашаніўскім пэрыодам маёй літаратурнай працы, калі я стаў быў адным з ідэолёгаў буржуазна-дэмократычнага „адраджэнства“ і „незалежніцтва“, я і пасьля Кастрычніцкае рэволюцыі не адмежаваўся, як гэта належала, ад акружаючага мяне нацыянал-дэмократычнага асяродзішча, а быў уцягнуты ім і прыняў самы блізкі ўдзел у контр рэвалюцыйнай рабоце віднейшых беларускіх нацыянал-дэмократаў, якія на грунце конституцыі Савецкае Беларусі, скарыстаўшыся давер'ем, якое аказана было ім з боку савецкай улады, прыкрываючыся хлусьлівай заслонай фальшывых крывадушных дэкларацый і запэўненьнем, праводзілі свае шкодніцкія нацыянал-дэмократычныя ідэі на культурным фронце.

Працуючы ў навукова-тэрміналёгічнай камісіі, у Інбелкульце і БАН, гэтых кіруючых штабах беларускага нацыянал дэмократызму, бачачы сваімі вачыма іхнія нясумяшчальныя з інтарэсамі беларускіх працоўных мас і запатрабаваньнямі партыі савецкае ўлады ўстаноўкі і мерапрыемствы ў культурным будаўніцтве, я ня толькі ні разу не асудзіў іх, але, наадварот, маральна падтрымліваў і дапамагаў іх рэалізацыі.

Але гэты этап пройдзен. Цяпер я бачу ўсю шкоднасьць і гібельнасьць таго шляху, па якім памыкаліся беларускія нацыянал-дэмократы павярнуць ход гісторыі. Гіганцкімі крокамі ідзе культурнае і эканамічнае будаўніцтва Беларусі. Краіна, бышая ўвасабленьнем рабства, убоства і беспрасьветнай цемры, ператвараецца ў краіну вольнае працы. На месцы некалі гнілых дрыгвяных балот вырастаюць фабрыкі, заводы, электрастанцыі. На месцы ўбогіх сялянскіх палосак красуюцца колгасныя нівы, навейшыя дасягненьні аграноміі, тэхнікі і пладатворчай колектыўнай працы. На месцы народнай цемры вырастаюць бязупынна ўсё новыя і новыя культурныя, навуковыя і навучальныя ўстановы.

Будуецца соцыялізм.

Балюча і цяжка ўсьведамляць мне сёньня, што я, адарваўшыся ад здаровага творчага асяродзішча рэволюцыйных пролетарскіх працоўных мас і ўвесь час ўтапаючы ў пратухлым балоце акружаючых мяне контр-рэволюцыйных нацыянал дэмократычных „дзеячоў“ з авантурыстычным політычным мінулым—я так сьлепа, так упарта на працягу раду год ідэолёгічнымі памылкамі ў сваёй творчасьці, популярнасьцю і аўторытэтам, як народны поэта, не дапамагаў з усёй аддавасьцю і захапленьнем ажыцьцяўленьню заветных лятуценьняў чалавецтва, ажыцьцяўленьню соцыялізму.

Балюча і цяжка. Але гэты чад, як сон кашмарны, мінуў. Сёньня я, пранікнуты яснай сьвядомасьцю, я рашуча і раз назаўсёды, як у сваёй літаратурнай творчасьці, так у сваіх імкненьнях і грамадзкай дзейнасьці, парываю з беларускім нацыянал-дэмократызмам ва ўсіх яго праяўленьнях.

У нашу векапомную эпоху гэроічнага змаганьня пролетарыяту за вызваленьне працоўных з-пад няволі капіталізму, калі пролетарыят усё старое ністожыць і на руінах гэтага старога будуе новае соцыялістычнае існаваньне,—праступна ўваскрашаць мінулае, прасякнутае нявольніцка-буржуазнымі капіталістычнымі традыцыямі, праступна ўтвараць нацыянальную адмежаванасьць, асноўваючыся на самабытнасьці, гэта значыць на па-заклясавасьці якой-бы ня было нацыі ці народу.

Парываючы сам катэгорычна і беспаваротна ідэйна і організацыйна з беларускім нацыянал-дэмократызмам, як з нейкай хвараблівай зданьню, якая палоніла мяне на працягу доўгіх год майго сьвядомага жыцьця, я шчыра жадаю, каб гэты мой горкі вопыт паслужыў навукай для тэй часткі беларускай інтэлігенцыі, якая яшчэ ня зусім вызвалілася ад нацыянал-дэмократычнага шалупіньня, якая канчаткова ня прышла да перакананьня, што толькі працуючы пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі, гэтага авангарду рабочае клясы, толькі аддаючы свае сілы на соцыялістычнае будаўніцтва, яна ня будзе адмецена жыцьцём, як агідная памятка рабскага мінулага.

Усе сілы—сацыялістычнаму будаўніцтву на зацьвітаючай новымі агнясьветнымі краскамі індустрыяльна-колгаснай глебе Савецкай Сацыялістычнай Беларусі!

Няхай жыве культура, зьмест і форма якое выпісаны на ленінскім сьцягу найвялікшым сучасным правадыром пролетарыяту т. Сталіным,—культура—пролетарская па свайму зьместу, нацыянальная па форме!

Няхай жыве Комуністычны Інтэрнацыянал, гэты адзіны загартаваны правадыр, які вядзе чалавецтва да новага сьветлага радаснага жыцьця.

Няхай жыве Беларуская Соцыялістычная Савецкая Рэспубліка, адзін з краявуглавых каменьняў Савецкага Саюзу!

Няхай жыве СССР, братняя дапамога якога забясьпечвае нявіданыя і нячуваныя тэмпы разьвіцьця Савецкай Соцыялістычнай Беларусі.

Янка Купала.

Менск, 10-XII—1930 г.

Да фінішу сьвінаводчай эстафэты

ОРГАНІЗАВАНА ІСЬЦІ ДА ФІНІШУ

Наркомзем і Белколгасцэнтр уключыліся ў правядзеньне фінішу сьвінаводчай эстафэты комсамолу

Шырока разгарнуўшы праверку сваёй работы, згуртуем працоўныя масы вёскі—выканаем дырэктывы XVI-га партыйнага зьезду

Выканаць дырэктывы партыі

XVI партзьезд вызначыў месца, якое павінна заняць сьвінагадоўля ў вырашэньні мясной проблемы. Ва ўмовах Беларусі, як адным з сьвінаводчых раёнаў Саюзу, стварэньне высока-таварных спэцыялізаваных сьвінаводчых савгасаў і колгасаў зьяўляецца адной з асноўных задач усёй пролетарскай грамадзкасьці.

У гэтым годзе мы прыступілі да практычнага выкананьня дырэктыў партыі і ураду ў галіне будаўніцтва буйных, сьвінаводчых колгасаў і савгасаў. Ужо зараз паасобныя раёны, савгасы і колгасы паказалі прыклады сапраўдных бальшавіцкіх тэмпаў работы па форсаванаму разгортваньню прамысловай сьвінагадоўлі.

Аднак, кіраўнікі шэрагу раёнаў, савгасаў і колгасаў яшчэ і да гэтага часу недааценьваюць гаспадарча-політычнага значэньня організацыі спэцыялізаваных сьвінаводчых колгасаў і савгасаў. Вынікам гэтае недаацэнкі зьяўляецца: зусім недастатковая мобілізацыя мас рабочых савгасаў, колгасьнікаў, комсамольскіх і профсаюзных організацый вакол пытаньня сьвінагадоўлі, у сувязі з чым будаўніцтва сьвінарнікаў, укомплектаваньне і ўкараненьне зооветмінімуму ў сьвінаводчых савгасах і колгасах праходзіць зьлачынна-марудпымі тэмпамі.

Урадам БССР праводзіўся месячнік сьвінагадоўлі, ЦК ЛКСМБ організавана сьвінаводчая эстафэта. Асноўныя задачы гэтых мерапрыемстваў—мобілізацыя мас на ліквідацыю ўсіх прарываў на сьвінаводчым фронце. У раёнах, аднак, ня выкарысталі поўнасьцю гэтай кампаніі, каб стварыць адпаведны пералом у працы і выканаць плянавыя заданьні па сьвінагадоўлі. Застаўшыяся 17 дзён ударнага кварталу павінны быць выкарыстаны ўсімі цэнтральнымі, раённымі і мясцовымі організацыямі для рашучай мобілізацыі рабочых савгасаў, колгасьнікаў, комсамольцаў, савгаснай і колгаснай моладзі на поўнае выкананьне заданьняў па організацыі сьвінаводчых савгасаў і колгасаў. Фініш сьвінаводчай эстафэты, які праводзіцца зараз комсамолам, павінен паказаць конкрэтную працу ўсіх райорганізацый па выкананьню гэтых важнейшых дырэктыў партыі.

Пастанова ЦК ЛКСМБ, колегіі НКЗ і колгасцэнтру, паданыя сёньня ў газэце, абавязваюць комсамольскія організацыі, райза і колгасна-кооперацыйную сыстэму па-баявому падвесьці вынікі месячніку і фініш эстафэты. Асабліва адказная задача ўскладаецца на комсамольскія організацыі, якія павінны быць штурхачамі ўсяе грамадзкасьці ў правядзеньні гэтых мерапрыемстваў. Неабходна зараз-жа мобілізаваць усіх комсамольцаў, рабочую, батрацкую і колгасную моладзь на практычны ўдзел і праверку працы ўсіх організацый у будаўніцтве спэцыялізаваных сьвінаводчых колгасаў і савгасаў. Неабходна забясьпечыць правядзеньне ў тэрмін раённых сьвінаводчых конфэрэнцый і шырокае абгаварэньне вынікаў работы на сходах рабочых савгасаў, колгасьнікаў, комсамольцаў, высьвятляючы пры гэтым усе недахопы ў працы, а таксама і вызначаючы конкрэтныя мерапрыемствы па зьнішчэньню гэтых недахопаў.

Пасьпяховае правядзеньне ўсіх гэтых задач магчыма толькі пры рашучай барацьбе з кулацтвам і яго агентурай—правымі опортуністымі, якія імкнуцца сарваць будаўніцтва соцыялістычных фабрык мяса.

Комсамольская організацыя к X зьезду павінна прыйсьці з конкрэтнымі вынікамі ўдзелу ЛКСМБ у ажыцьцяўленьні адной з адказнейшых задач партыі па разьвіцьцю сьвінагадоўлі.

Рудніцкі—Жырковіч.

Распачалі падрыхтоўку да сьвінаводчай эстафэты

ВОРША 13. (Ад нашага спэцкора). Аршанская комсамолія распачала практычную работу па правядзеньню сьвінаводчай эстафэты ў раёне. 14 сьнежня намечана правесьці нараду сэкратароў савгасных, колгасных і вясковых ячэек ЛКСМБ разам з прадстаўнікамі ўсіх зацікаўленых організацый.

Атрады лёгкай кавалерыі Пэдтэхнікуму, Дарбудвучу, ячэйкі будаўнікоў колектыву і профтэхшколы з 10 сьнежня распачала масавую самаправерку работы сьвінаводчых колгасаў, савгасаў і першапачатковых таварыстваў.

Пасьля самаправеркі ў сьвінаводчых савгасах і колгасах будуць праведзены адкрытыя сходы ячэек ЛКСМБ з рабочымі, колгасьнікамі і аднаасобнымі бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі.

РБ ЛКСМБ абавязаў Пугаеўскую, Кашанскую, Бразьдзечнскую і Міцькаўскую ячэйкі ЛКСМБ прыняць актыўны ўдзел у будаўніцтве сьвінарнікаў у колгасах „Юны Творца“, „10-годзьдзе Кастрычнікавай рэволюцыі“. „1 жніўня“, „Вызваленьне жанчын“ і „Прамень“.

Фініш эстафэты ў раёне адбудзецца 29 сьнежня. У гэты-ж дзень будзе праведзена раённая конфэрэнцыя савгасьнікаў і колгасьнікаў, прысьвечаная разьвіцьцю сьвінагадоўлі. На конфэрэнцыі будуць заслуханы рапарты комсамольскіх ячэек савгасаў Вусьце і Бабынічы, колгасаў „Кашынская Комуна“ і „Ленінскі Шлях“ аб удзеле ячэек у разьвіцьці сьвінагадоўлі. На конфэрэнцыі адбудзецца прэміяваньне лепшых ячэек савгасаў і колгасаў і прыём эстафэты з акаляючых раёнаў.

Для правядзеньня падрыхтоўчай работы да фінішу эстафэты, у савгасы і колгасы камандыравана 6 чалавек на 7 дзён.

Х. Б.

Пастанова

колегіі Народнага Камісарыяту Земляробства БССР ад 10 сьнежня 1930 года аб удзеле РАЙЗА, колгасна-кооперацыйнай сыстэмы і белканторы „Сьвінавод“ у фінішы сьвінагадоўчай эстафэты комсамолу.

Колегія НКЗ БССР пастанаўляе:

1. Лічыць неабходным падтрыманьне ініцыятывы „ЦК ЛКСМБ у правядзеньні фінішу сьвінагадоўчай эстафэты.

2. Абавязаць белкантору „Сьвінавод“, РАЙЗА і колгасна-кооперацыйную сыстэму ўключыцца ў правядзеньне фінішу сьвінагадоўчай эстафэты.

3. Прапанаваць Райза, колгасна-кооперацыйнай сыстэме і белканторы „Сьвінавод“:

а) правядзеньне фінішу сьвіна-доўчай эстафэты ўвязаць з над-дзеньнем вынікаў месячніку сьві-гадоўлі і праверкі выкананьня зо-вэтмінімуму сьвінаводчымі гасп-даркамі;

б) разам з комсамольскімі орг-нізацыямі дабіцца мобілізацыі ра-чых савгасаў, колгасьнікаў і ус-савецкай грамадзкасьці на поў-выкананьне плянавых заданьня-галіне прамысловае сьвінагадо-на працягу ўдарнага кварталу.

Нарком земляробства Рачыц-

Пастанова

праўленьня Белкалгасцэнтру аб уключэньні колгассыстэмы ў правядзеньні фінішу сьвінаводчай эстафэты комсамолу.

Адзначаючы вялікую ролю сьвінаводчай эстафэты, якая праводзілася ЦК ЛКСМБ, у справе разьвіцьця сьвінагадоўлі ў колгасах і асабліва ў справе пасіленьня працы па організацыі буйных прамысловых сьвінагадоўчых колгасаў, праўленьне Белколгасцэнтру пастанаўляе:

1. Прапанаваць усім Райколгассаюзам, Райколгассэкцыям і праўленьням колгасаў безадкладна ўключыцца ў правядзеньне фінішу сьвінаводчай эстафэты комсамолу і прыняць самы актыўны ўдзел у гэтай справе.

2. Усім Райколгассаюзам, Райколгассэкцыям і праўленьням колгасаў зьвязацца з адпаведнымі комсамольскімі організацыямі і аказаць ім конкрэтную дапамогу ў організацыі і правядзеньні фінішу сьвінаводчай эстафэты.

3. Усю работу па правядзеньню фінішу сьвінаводчай эстафэты пабудаваць пад кутом погляду праверкі і самаправеркі работы па выкананьню дырэктыў партыі і ўраду па разьвіцьцю сьвінагадоўлі ў ко-гасах.

4. На падставе праверкі і са-праверкі распрацаваць конкрэ-плян мерапрыемстваў, накірава-на ліквідацыю маючыхся прары-і своечасовае выкананьне пляну сьвінагадоўлі.

Асаблівую ўвагу зьвярнуць выкананьне плянавага заданьня організацыі, будаўніцтву, укомпл-таваньню сьвінагадоўчых колга-і забясьпечаньню іх сьвінога с-адпаведнымі кармамі.

5. На выкананьне заданьняў разьвіцьцю сьвінагадоўлі ў ко-сах мобілізаваць раённыя орга-цыі і ўстановы і шырокія м-самых колгасьнікаў.

6. Шырока разгарнуць соцспа-ніцтва і ўдарніцтва паміж раё-і колгасамі па ліквідацыі прары-і хутчэйшаму выкананьню пля-вых заданьняў;

7. Сэкратарыяту даць указа-усім працаўнікам Белколгасцэнт-якія знаходзяцца ў раёнах, каб дапамаглі раённым, колгасны-комсамольскім організацыям у пр-вядзеньні фінішу сьвінаводчай эс-фэты.

Праўленьне Белколгасцэнт-

Паведамленьні

ЦБ ДКО. 15 сьнежня г. г., -гадзіне ўвечары, у памяшка-ЦК ЛКСМБ (3 паверх) адбуд-пашыранае пасяджэньне прэзыд-ЦБ ДКО пры ЦК ЛКСМБ разам з -стаўнікамі, комуністамі і комсам-мі, важатымі фарфостаў, пав. піон-атрадаў і сэкратарамі пр-ымап-ных яч. КСМ. Абвестка дня: аб -новішчы школ гор. Менску. С-клад фарпостаў школ: 2, 18 і -гувачнікаў імя Чарвякова.

Яўка намянёных абавязкова.

ЦБ ДКО пры ЦК ЛКСМ-

Сёньня, а 7 гадзіне ўвечары, -памяшканьні рэдакцыі „Белару-Веска“ адбудзецца пасяджэньне -ро колектыву ЛКСМБ рэдакцый -зэт. Яўка членаў бюро і орга-тараў груп абавязкова. На б-таксама павінны зьявіцца тава-шы Сяргіевіч і Адашчык.

Бюро

АДКАЗНЫ РЭДАКТАР-
РЭДКОЛЕГ-

Згублены

— Цітаўскі білет за № 14, -імя Тупіка Л. Ш., выд. Мен-ЦІТ'ам.

— Комсам. біл. за № 86518 -імя Лубільніка Ш. У., выд. -АК БСМ.

Вечар братэрскага спатканьня

Гав. Мятла і тав. Грэцкі расказваюць аб становішчы прыгнечаных польскім фашызмам працоўных мас Заходняй Беларусі і Украіны

(на сходзе працоўных—сяброу МОПР'у г. Менску)

У клюбе Комуністычнай Асьветы электрычнае сьвятло залівае залі. Шмат лікія лёзунгі клічуць змагацца за выкананьне промфінпляну, узмацняць абароназдольнасьць нашае краіны.

Сход абірае ў прэзыдыум т. т. Мятлу, Рак-Міхалоўскага, Грэцкага, Бурсэвіча, прадстаўнікоў ЦК МОПР'у Беларусі, прадстаўнікоў ад Фрунзэўскага і Кастрычніцкага райкомаў партыі, ад ЦК комсамолу Беларусі. У ганаровы прэзыдыум абраны тав. Валошын, які зараз знаходзіцца за турэмнымі кратамі у Польшчы і іншыя таварышы, якія сёньня яшчэ сядзяць у турмах Заходняй Беларусі.

Пасьля ўступнае прамовы старшыні прэзыдыуму, які ў агульных рысах ахарактарызаваў міжнароднае становішча, атрымаў слова былы правадыр стотысячнай рэволюцыйнай грамады Зах. Беларусі—тав. Мятла. Сьпярша тав. Мятла вітае агульны Менскі МОПР'аўскі сход ад імя працоўных Зах. Беларусі, Заходняй Украіны і Польшчы.

Спыніўшыся на гісторыі Зах. Беларусі і Зах. Украіны, тав. Мятла адзначыў, што пасьля Кастрычнікаўскае рэволюцыі пад польска-фашыстоўскае ярмо папала частка Беларусі з 3-мя мільёнамі чалавек і частка Украіны з 7-мі мільёнамі чалавек, ня кажучы ўжо аб іншых нацменшасьцях.

Спачатку некаторая частка працоўных беларусоў нават верыла, што польскі фашызм праз сойм дасьць магчымасьць жыць і працаваць беларускаму працоўнаму насельніцтву на нацыянальнай мове. Але праз год прышлося пераканацца, што сойм заўзятая буржуазная ўстанова—працоўным нічога не дае.

З мэтаю полёнізацыі, з мэтаю мець сваіх шпікоў у гушчах працоўных польска-фашысцкая дыктатура на абшарах Заходняй Беларусі насаджвае асаднікаў, якія ўяўляюць сабою перааправутую дэфэнзыву.

Калі былыя паслы Грамады выступалі ў сойме супроць такога асадніцтва, дык ім не давалі гаварыць, асьвісталі. „Нам,—кажа тав. Мятла,—прыходзілася нашы прапановы выпісваць на дошцы і такім чынам галасаваць за іх, бо публіка нас ня чула“.

Але-ж прапановы даходзілі да спачуваючых ім у сойме. Заўважыўшы гэта, пілсудчыкі бралі грамадаўскіх паслоў і па адным выносілі з залі, выключаючы з сойму“.

Разам з ростам савецкіх рэспублік расьце і рэволюцыйны рух у Заходняй Беларусі, Зах. Украіне і паміж працоўных Польшчы. Гэта прымушае Польшчу ў 1926 годзе рабіць пераварот. Да ўлады прышоў Пілсудзкі, які яшчэ больш прыцісвуў працоўныя масы. Выбары ў сойм праводзяцца кожны раз шальмоўствам пад біўнамі фашысцкай жандармэрыі.

І недарма ў кожнай воласьці па 17 паліцыйскіх на месца аднаго царскага ўрадніка. У кожнай воласьці безьліч шпікоў, узброеных вінтоўкамі, а нават і кулямётамі, асаднікаў утрымліваюцца фашызмам.

„Калі былі апублікаваны лічбы пяцігодкі,—кажа тав. Мятла,—то польская буржуазія, як і сусьветная буржуазія, падняла іх на сьмех, лічачы пяцігодку выдумкай і марамі бальшавікоў. Але праз год польская буржуазія ўжо не сьмяялася, бо на справе пераканалася што бальшавікі пяцігодку выконваюць і выканаюць яе за чатыры гады. Адгэтуль азьвярэлы скрыгат зубоў і імкненьні спровакаваць Савецкі Саюз на вайну, каб пашкодзіць і спыніць будаўніцтва, аб гэтым гаворыць і забойства т. Войкава, і замах на Елізарава, і сьмехатворныя выдумкі з нейкім Куцепавым, савецкі дэмпінг і г. д.

Наколькі Польшча рыхтуецца да вайны відаць хоць-бы з таго, што толькі па афіцыйных паведамленьнях яе вайсковы бюджэт складае 46 проц. агульнага бюджэту дзяржавы. А колькі бюджэтаў тайных! „Але ўсе гэтыя проценты, усе гэтыя тайныя бюджэты сваім джалам будуць павернуты тымі, хто сёньня зьбіраецца дзе-небудзь у лесе ці падвале, супроць „сваёй“ буржуазіі,—творцы гэтых бюджэтаў“.

Пад бурныя воплескі таварыш Мятла канчае сваю прамову словамі:—„Няхай жыве комуністычная партыя! Няхай жыве сусьветная рэволюцыя!“

Пасьля выступленьня т. Мятлы бярэ слова адзін з былых кіраўнікоў клюбу „Змаганьне“—т. Грэцкі.

Перадаўшы прывітаньне ад працоўных Заходняй Беларусі, тав. Грэцкі кажа:

— „Я—адзін з тых 6-ці, каго пролетарыят Заходняй Беларусі паслаў у сойм абараняць інтарэсы пролетарыяту.

Той крызіс, які перажывае ўвесь капіталістычны сьвет, ахапіў і Польшчу. Вынікі гэтага крызісу пераносіць на сваіх плячох і рабочы і працоўны селянін. Крызіс выкідае сотні і тысячы беспрацоўных на вуліцу. Аб гэтым гавораць лічбы: 40 проц. рабочых у Польшчы выкінута на вуліцу, 20 проц. рабочых працуе па 2-3 дні ў тыдзень, і 40 проц. працуе на тых заводах, дзе рыхтуецца рознае ўзброеньне

Зарплата рабочых Жабрацкая—100 злотых у месяц. Сямейныя рабочыя галадаюць, ня маюць дзе жыць. Гэты лік на сёньня ўжо не дакладны, бо там беспрацоўе з кожным днём расьце.

Дапамогу атрымліваюць толькі тыя беспрацоўныя, якія да звальненьня працавалі 20 тыдняў на адным месцы. Дапамогу выдаюць у памеры ад 15 проц. да 40 проц. зарплаты, ды і то толькі за 15-17 тыдняў. А пасьля —хоць памірай.

Зараз на тэрыторыі Зах. Беларусі, Зах. Украіны. Польшчы не праходзіць таго дня, каб ня было наладжана дэмонстрацыі з патрабаваньнем працы і хлеба. Але на гэта фашызм адказвае карнымі экспэдыцыямі“.

Далей тав. Грэцкі расказвае аб катаваньні, імкненьні фізычна зьнішчыць усіх, хто ў той ці іншай ступені рэвалюцыйна настроены.

„Папаўшымся ў турму адбіваюць пячонкі, пасьля чаго чалавек памірае альбо ў турме, альбо па выхадзе адтуль“.

„Люты вораг працоўных мас Заходняй Беларусі і найлепшы дапаможнік фашызму—соцыял-фашыстыя і нацыянал-фашыстыя, якія нічога іншага не ўяўляюць, як перааправутую дэфэнзыву. Аб гэтым працоўныя масы Заходняй Беларусі добра ведаюць і кіраўніком сваім лічаць толькі комуністычную партыю.

Аўдыторыя з вялікай увагай і напружаньнем слухае прамову таварыша Грэцкага і тав. Мятлы. Працоўныя Менску, з вуснаў тых людзей, якія ўсю „чароўнасьць“ польскага фашызму пераносілі на сваіх плячох, маюць магчымасьць даведацца аб сапраўды жахлівым стане працоўных Заходняй Беларусі і іх рэвалюцыйным змаганьні.

Тодар Алесін.

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599